гае бачыць сувязь моўных з’яў з абазначэннем акаляючай нас рэчаіснасці, з выбарам і стварэннем назваў для асобных яе фрагментаў і тым самым, фарміруе камунікатыўна-маўленчую кампетэнцыю будучых настаўнікаў.

**Спіс літаратуры**


1. Кубрякова, Е. С. Части речи в ономасиологическом освещении / Е. С. Кубрякова. – М. : Изд-во ЛКИ, 2010. – 120 с.
2. Шкатова, Л. А. Ономасиологические проблемы русской терминологии / Л. А. Шкатова. – Челябинск, 1982. – 87 с.
3. Лингвистический энциклопедический словарь / под ред. В. Н. Ярцева. – М. : Советская энциклопедия, 1990. – 685 с.
4. Стернин, И. А. Проблемы анализа структуры значения слова / Стернин И. А. – Воронеж : Изд-во Воронеж. ун-та, 1979. – 156 с.
5. Уфимцева, А. А. Лексическая номинация (первичная, нейтральная) / А. А. Уфимцева // Языковая номинация (Виды наименований). – Москва, 1977. – С. 5–85.


# РОЛЯ МІЖПРАДМЕТНЫХ СУВЯЗЕЙ У ФАРМІРАВАННІ АНАМАСТЫЧНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ


*Вагулька М.А.,*

*ДУА «Гімназія №2 г. Магілёва», г. Магілёв*



Анатацыя. У артыкуле раскрываецца роля міжпрадметных сувязей пры фарміраванні анамастычнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў, прыводзяцца прыклады практыкаванняў, заснаваных на інтэграцыі розных школьных прадметаў.



*Ключавыя словы: анамастычная кампетэнцыя, антрапонім, тапонім, міжпрадметныя сувязі, руская мова, беларуская мова, літаратурнае чытанне, «Чалавек і свет».*


Сучаснае, постіндустрыяльнае, грамадства, вылучаецца полікультурнасцю, сацыяльнай мабільнасцю, адкрытасцю, інфармацыйнасцю. У сувязі з гэтым многія традыцыйныя сацыяльныя праблемы патрабуюць новых падыходаў да іх вырашэння.

Сістэма ўласных імёнаў, якая бытуе у пэўным грамадстве, адна з першых рэагуе на сацыяльныя змены. У сучасным беларускім грамадстве ўзнікае шэраг пакуль што не вырашаных пытанняў функцыянавання онімаў, сярод якіх – суадноснасць антрапонімаў у рускай і беларускай мовах, транслітарацыя антрапонімаў сродкамі лацінскай мовы [4], правапіс і скланенне ўласных імёнаў у рускай і беларускай мовах і інш.

Сучасная сітуацыя патрабуе ад кожнага члена грамадства наяўнасці базавых ведаў па ўжыванні ў маўленні ўласных імёнаў. Таму можна паставіць пытанне пра фарміраванне анамастычнай кампетэнцыі, бо, як вядома, кампетэнцыя – гэта перш за ўсё заказ грамадства [6]. Пачатак фарміраванню гэтай кампетэнцыі павінен быць закладзены на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Анамастычная кампетэнцыя ўключае ў сябе два асноўныя комплексы ведаў, уменняў і навыкаў, суадносныя з двума галоўнымі раздзеламі анамастыкі – антрапанімікай і тапанімікай. ***Антрапанімічная кампетэнцыя*** – гэта веды, уменні і навыкі правільнага ўжыванні ўласных імён людзей у вусным і пісьмовым маўленні, ***тапанімічная кампетэнцыя*** – гэта веды, уменні і навыкі правільнага ўжыванні геаграфічных назваў у вусным і пісьмовым маўленні.

Антрапонімы і тапонімы традыцыйна разглядаюцца як частка лексічнай сістэмы пэўнай мовы, таму фарміраванне анамастычнай кампетэнцыі адбываецца на ўроках мовы і чытання. Але не трэба забываць, што антрапонімы і тапонімы заключаюць у сабе значную этнаграфічную, гістарычную, культурную інфармацыю, таму фарміраванне анамастычнай кампетэнцыі немагчыма здзейсніць без рэалізацыі міжпрадметных сувязей паміж рознымі прадметамі, што вывучаюцца ў пачатковай школе.

У навуковай літаратуры існуе больш за трыццаць азначэнняў паняцця ***міжпрадметныя сувязі.*** Мы будзем кіравацца наступным: «Межпредметные связи – дидактическое условие, способствующее отражению в учебном процессе интеграции научных знаний, их систематизации, формированию научного мировоззрения, оптимизации учебного процесса и наряду и этим, позволяющее каждому учащемуся раскрыть и реализовать свои потенциальные возможности, опираясь на ценностные ориентации» [2, с. 3].

У школьных падручніках па беларускай і рускай мовах не так часта сустракаюцца заданні, арыентаваныя на працу з уласнымі імёнамі, аднак выкананне многіх з іх немагчыма без прыцягнення ведаў, якія набыты на іншых занятках і якія можна выкарыстаць пры вывучэнні іншых школьных прадметаў. Так, пры вывучэнні тэмы *«Напісанне вялікай літары ў словах» у* падручніку па беларускай мове прапануецца прачытаць верш Ю.Свіркі «Твая Беларусь» і выпісаць у алфавітным парадку назвы краін, з якімі мяжуе Беларусь: *Латвія, Польшча, Украіна, Расія, Літва* [5, с. 58]. У падручніку па рускай мове вучням пры вывучэнні такой жа тэмы прапануецца падабраць агульныя назвы да кожнай групы слоў: *1 группа – Минск, Молодечно, Витебск, Могилев, Барановичи, Новогрудок, Лида, Полоцк, Брест, Шклов; 2 группа – Березина, Сож, Свислочь, Нёман, Припять, Днепр, Буг, Двина* [1, с. 19].

Многія дадатковыя пытанні, прапанаваныя ў падручніках па рускай і беларускай мовах, патрабуюць ад вучняў ведаў па прадмеце «Чалавек і свет». Так, навучэнцам прапануцца адказаць на пытанні: У якім горадзе (вёсцы) ты жывеш? На якой вуліцы ты жывеш? Як называецца рака ці возера, якія ёсць у вашым горадзе (вёсцы)? [5, с. 61]; Какая река протекает в Минске? Какой белорусский город носит женское имя? Названия каких городов Беларуси различаются одной буквой? В каком городе ты живешь? Как называется река (озеро), на которой стоит твой город (деревня)? [1, с. 22].

Нярэдка ў падручніках прадстаўлены матэрыял, які дае магчымасць успомніць гістарычнае мінулае Беларусі. Так, пры вывучэнні верша А.Вольскага «Хачу служыць» [3, с. 15] неабходна ўзгадаць, якія падзеі ў гісторыі нашай Радзімы звязаны з тапанімічнымі назвамі Грунвальд і Орша.

На нашу думку, можна і трэба разнастаіць формы інтэграцыі розных школьных прадметаў пры знаёмстве і працы з уласнымі імёнамі.

Так, карысна, па нашым меркаванні, было б прапанаваць вучням 3-4 класаў заданне злучыць беларускую форму імені з рускім адпаведнікам:

| | |
|---|---|
| Змітрок | Коля |
| Мікола | Анна |
| Ганна | Филипп |
| Піліп | Дима |
| Рыгор | Петя |
| Петрык | Григорий |

Заданне такога тыпу, арыентаванае на разуменне спецыфікі беларускай антрапанімічнай сістэмы, дазволіць рэалізаваць сувязі паміж рускай і беларускай мовамі.

Пры вывучэнні склянення назоўніка можна прапанаваць праскланяць імёны *Пётр Машэраў, Дар’я Домрачава, Адам Мицкевич, Марк Твен і* інш., якія сустракаюцца на старонках падручнікаў па літаратурным чытанні і «Чалавек і свет».

Пашырыць веды пра геаграфію Беларусі дапамогуць наступныя заданні:

*да слоў з левага слупка падбярыце словы з правага слупка.*

| | |
|---|---|
| рака | Нарач |
| горад | Днепр |
| возера | Магілёў |

*прачытайце верш К.Цвркі, выпішыце з яго назвы рэк, азёраў, гарадоў.*

***Там яна***

Там яна, дзе Буг аблокі
Пазбіраў з усіх нябёс,
Дзе Вілля, Дняпро шырокі,
Белавежа, Налібокі,
Нёмна песеннага плёс.
Там яна, дзе Прыпяць, Шчара,
Случ, Бярэзіна, Дзвіна,
Дзе Князь-возера і Нарач,
Свіцязь светлая, як мара,
І Бяздоннае без дна.
Там яна, дзе Тураў, Полацк –
Найстарыя гарады,
Мінск, чый чутны ўсюды голас,
Гомель, Віцебск, Брэст вясёлы,
Горад солі малады.

*К. Цвірка*

Карыснымі для пашырэння кола чытання малодшых школьнікаў, на наш погляд, будуць заданні тыпу *дапамажыце бібліятэкару расставіць карткі з прозвішчамі пісьменнікаў па алфавіце:* 1) Ягоўдзік, Гілевіч, Сачанка, Ліпскі,

Грачанікаў, Броўка, Вольскі, Дайнека, Чарняўскі; 2) Есенин, Пушкин, Андерсен, Бальмонт, Орлов, Паустовский, Заходер, Бунин, Уайльд, Лермонтов.

Вучням 4 класа можна прапанаваць такое заданне: *Суаднясіце імя гістарычнай асобы з яго характарыстыкай:*

| | |
|---|---|
| Францыск Скарына | сын Рагнеды, князь. |
| Яраслаў Мудры | перапісвала кнігі, вучыла дзяўчынак чытаць і пісаць, рабіць розныя хатнія справы. |
| Ефрасіння Полацкая | манах, пісаў павучанні пра тое, як павінны жыць людзі. |
| Кірыла Тураўскі | вучоны, друкаваў кнігі на старабеларускай мове. |

Гульні, звязаныя з ужываннем уласных імёнаў, можна праводзіць на ўроках фізічнай культуры: напрыклад, пры гульні ў мяч прапанаваць дзецям успомніць імёны дзяўчат, хлопчыкаў, назвы гарадоў, рэк і г.д.

У якасці дыягнастычнага матэрыялу для праверкі ступені сфарміраванасці анамастычнай кампетэнцыі можна выкарыстаць інтэграваныя заданні:

– стварыць сваю візітоўку, у якой вучань павінен указаць сваё імя, прозвішча, назву краіны, горада, вуліцы, дзе жыве;

– расказаць сябру, якія прыехаў з-за мяжы, пра сваю краіну, горад (вёску);

– скласці дыялог паміж прадстаўнікамі розных краін;

– расказаць пра іншую краіну ад імя яе жыхара і інш.

Прапанаваныя заданні мяркуюць пашырэнне ведаў па розных школьных прадметах, будуць спрыяць развіццю агульнай культуры школьнікаў, пашырэнню іх кругагляду.

**Спіс літаратуры**


1. Антипова, М. Б. Русский язык : учеб. для 2 кл. учреждений общ. сред. образования с рус. языком обучения : в 2 ч. / М. Б. Антипова, А. В. Верниковская, Е. С. Грабчикова. – Минск : Нац. ин-т образования, 2016. – Ч. 2. – 127 с.
2. Беляева, Н. В. Межпредметные связи как средство интенсификации обучения языку и литературному чтению / Н. В. Беляева // Современный урок языка и литературного чтения в начальной школе: эффективная организация образовательного процесса : сб. материалов регионального науч.-метод. семинара, Брест, 12 нояб. 2015 г. / Брест. гос. ун-т ; научный редактор Г. М. Концевая. – Брест, 2016. – С. 3–7.
3. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 3 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2017. – Ч. 2. – 118 с.
4. Лукашанец, А. А. Беларуска-рускае двухмоўе і праблемы сучаснай іменаслоўнай практыкі / А. А. Лукашанец // Региональная ономастика: проблемы и перспективы исследования : сб. научн. ст. / Витебск. гос. ун-т ; под науч. ред. А. М. Мезенко. – Витебск, 2016. – С. 180–184.
5. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : падруч. для 2 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2015. – Ч. 1. – 111 с.

6. Хуторской, А. В. Ключевые компетенции и образовательные стандарты [Электронный ресурс] / А. В. Хуторской // Интернет-журнал «Эйдос». – Режим доступа: http:www.eidos.ru/journal/ 2002/0423. – Дата доступа: 21.12.2015.

---

## ВЫКАРЫСТАННЕ ГУЛЬНІ-ПАДАРОЖЖА ДЛЯ ФАРМІРАВАННЯ ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ НАВУЧЭНЦАЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ НА ЗАНЯТКАХ ШКОЛЬНАГА КАМПАНЕНТА

*Васілеўская А.С., кандыдат філалагічных навук, дацэнт*
*Свірыдзенка В.І., кандыдат педагагічных навук, дацэнт*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, г. Мінск*

Анатацыя. У артыкуле абгрунтоўваецца магчымасць выкарыстання гульні-падарожжа для працы з фразеалагізмамі на занятках школьнага кампанента ў пачатковых класах, апісваюцца асаблівасці яе правядзення. Прыводзяцца формы работы з фразеалагічнымі адзінкамі, якія паспрыяюць фарміраванню лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі навучэнцаў пачатковых класаў.

*Ключавыя словы: лінгвакультуралагічная кампектэнцыя, фразеалагізмы, навучэнцы пачатковых класаў, гульня-падарожжа, факультатыў*

Вывучэнне беларускай мовы ў школе прадугледжвае развіццё асобы навучэнца, яго культурных арыенціраў, творчых схільнасцей і здольнасцей да сацыяльнага самавызначэння.

У адпаведнасці з ідэяй рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў агульнай сярэдняй адукацыі, у навучэнцаў павінна быць сфарміравана лінгвакультуралагічная кампетэнцыя, якая цесна звязана з моўнай і камунікатыўнай кампетэнцыямі і рэгулюе маўленчыя паводзіны чалавека. Лінгвакультуралагічная кампетэнцыя навучэнцаў-білінгваў патрабуе засваення нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай і рускай моў, якія сваім складам, значэннем і існаваннем адлюстроўваюць нацыянальную культуру. Да ліку такіх адзінак належаць фразеалагізмы.

Фраземы не з'яўляюцца аб'ектам спецыяльнага вывучэння на ўроках беларускай мовы ў пачатковых класах. Разам з тым, у падручніках па беларускай мове і літаратурным чытанні для 2 – 4 класаў сустракаецца вялікая колькасць фразеалагізмаў, многія з якіх патрабуюць ад настаўніка спецыяльна арганізаванай работы, накіраванай як на тлумачэнне значэння моўных адзінак, так і на іх актывізацыю ў маўленні навучэнцаў. Аднак абмежаваны аб'ём вучэбнага часу не дае магчымасцей вучням у дастатковай ступені пазнаёміцца з фразеалагічным багаццем беларускай мовы. Кампенсаваць гэта можна за кошт гадзін школьнага кампанента.

Менавіта гэтым абумоўлена распрацоўка праграмы і вучэбна-метадычнага забеспячэння факультатыўных заняткаў «У Краіне знаёмых незнаёмцаў», мэта якіх – фарміраванне лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі навучэнцаў шляхам развіцця ў іх здольнасцей правільнага ўжывання фразеала-